ЗАЦВЕРДЖАНА

Загад
Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
19.02.2019 № 33

# ПАЛАЖЭННЕ

аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу эскізных праектаў помніка народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу ў г.Стоўбцы

1. Мэтай конкурсу эскізных праектаў помніка народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу ў г.Стоўбцы (далей – конкурс) з’яўляецца пошук найбольш выразнага вобраза класіка беларускай літаратуры Якуба Коласа для стварэння помніка на яго малой радзіме.

2. Арганізатарам конкурсу з’яўляецца Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Мінскі абласны і Стаўбцоўскі раённы выканаўчыя камітэты.

3. Удзельнікамі конкурсу могуць быць скульптары і архітэктары, якія маюць адпаведную прафесійную адукацыю.

4. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца на афіцыйным сайце Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і змяшчае звесткі аб конкурсе, яго ўмовах, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых удзелькамі матэрыялаў, парадку і тэрмінах абвяшчэння вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі.

5. Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ў адпаведнасці з пунктам 14 Палажэння аб парадку стварэння (рэканструкцыі) і прыёмкі твораў манументальнага і манументальна-дэкаратыўнага мастацтва на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зацверджанага пастановай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 19 верасня 2008 г. № 1372.

6. Кампазіцыйнае і пластычнае выкананне помніка павінна быць вытрымана ў найлепшых традыцыях класічнага і нацыянальнага манументальнага мастацтва. Помнік павінен быць усталяваны ў скверы па вул.Цэнтральнай ў г.Стоўбцы (фотаматэрыялы месца размяшчэння прыкладаюцца).

Арыенціровачны кошт стварэння помніка за кошт сродкаў Стаўбцоўскага раённага выканаўчага камітэту не павінен перавышаць 200 тысяч беларускіх рублёў (з улікам кошту матэрыялаў).

7. Для прыняцця ўдзелу ў конкурсе ў тэрмін да 2 мая 2019 г. уключна падаецца заяўка па форме згодна з дадаткам да сапраўднага

Палажэння па адрасе: г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, каб. 309, кантактны тэлефон + 375 17 203 74 12.

Конкурсныя матэрыялы павінны быць прадстаўлены ўдзельнікамі конкурсу не пазней 17.00 2 мая 2019 г. па адрасе: г.Мінск, вул. Акадэмічная, 5, дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.

8. У мэтах захавання ананімнасці аўтараў конкурсныя матэрыялы прадстаўляюцца пад чатырохзначным нумарам, які ўказваецца на ўсіх матэрыялах у левым верхнім вугле, а таксама на канверце.

У запячатаны канверт удзельніка конкурсу ўкладваюцца інфармацыйны ліст, які змяшчае прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку (калі такое маецца), а таксама адрас і кантактны тэлефон удзельніка альбо калектыву ўдзельнікаў конкурсу.

Пры парушэнні ўмоў конкурсу і правіл афармлення і прадстаўлення конкурсных матэрыялаў праект не разглядаецца.

9. Конкурсныя матэрыялы разглядаюцца журы на закрытым пасяджэнні не пазней 15 мая 2019 г.

Склад журы конкурсу зацвярджаецца загадам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.

10. Рашэнне прымаецца ў прысутнасці не менш паловы складу журы адкрытым галасаваннем простай большасцю галасоў прысутных. Пры роўнай колькасці галасоў ”за“ і ”супраць“ голас старшыні журы з’яўляецца вырашальным. Рашэнне журы афармляецца пратаколам, які падпісваецца ўсімі членамі журы, якія прынялі ўдзел у галасаванні.

11. Крытэрыі ацэнкі эскізных праектаў:

адпаведнасць умовам конкурсу;

высокі прафесійны ўзровень;

выкарыстанне арыгінальнага рашэння;

адлюстраванне найбольш выразнага вобраза.

12. Канверты ўдзельнікаў конкурсу распячатваюцца пасля вынясення рашэння журы па выніках конкурсу.

13. Рашэннем журы вызначаецца эскізны праект, які заняў 1-е месца, і пераможца (аўтар гэтага эскізнага праекта).

14. Вынікі конкурсу публікуюцца ў тыднёвы тэрмін пасля вынясення рашэння журы на афіцыйным сайце Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Мінскага абласнога выканаўчага камітэту.

15. Пераможца конкурсу атрымлівае права на стварэнне помніка ў адпаведнасці з заканадаўствам.

16. Паштовыя і іншыя выдаткі ўдзельнікаў конкурсу аплачваюцца за іх кошт.

17. Пасля заканчэння работы журы конкурсныя матэрыялы вяртаюцца ўсім удзельнікам конкурсу.

Дадатак
да Палажэння аб парадку арганізацыі і правядзення конкурсу эскізных праектаў помніка народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу ў г.Стоўбцы

Форма

Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь

____________________________________
прозвішча, асабістае імя, імя па бацьку
(калі такое маецца),

____________________________________
тэлефон

ЗАЯЎКА НА ЎДЗЕЛ У КОНКУРСЕ

Прашу ўключыць мяне ў спіс удзельнікаў конкурсу эскізных праектаў помніка народнаму паэту Беларусі Якубу Коласу ў г.Стоўбцы.

Абавязуюся прадставіць конкурсныя матэрыялы не пазней 17.00 2 мая 2019 г. па адрасе: г.Мінск, вул. Акадэмічная, 5, дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа.

З умовамі конкурсу азнаёмлен і згодзен.

| __________________ | ________________________ | _______________ |
|---|---|---|
| ініцыялы, прозвішча | подпіс | дата |




Маштаб 1:50. ⇩ – пазначана месца ўстаноўкі.






Фотаздымкі Якуба Коласа





